# БІБЛІЯТЭЧНЫЯ ВЕЛАПАДАРОЖЖЫ ЯК ДЗЕЙСНЫ СРОДАК МІЖНАРОДНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

***Н. В. Жарская,***
*галоўны бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

Для бібліятэчнай супольнасці вялікае значэнне маюць разнастайныя навукова-практычныя канферэнцыі, семінары і лекцыі. Апошнім часам усё большае распаўсюджанне набываюць і нетрадыцыйныя спосабы прафесійнай камунікацыі. Да прыкладу, правядзенне творчых бібліятэчных лабараторый для маладых спецыялістаў, абмеркаванне надзённых праблем у скайп-канферэнцыях, наладжванне кантактаў з калегамі праз сацыяльныя сеткі.

Папулярнымі робяцца і невялікія велапрабегі ў падтрымку бібліятэк і чытання, асабліва ў межах святкавання дзён/тыдняў бібліятэк. Арганізуюцца яны ў розных краінах свету, найчасцей на лакальным узроўні. Аднак існуе і сапраўдная велаканферэнцыя для бібліятэкараў і прыхільнікаў бібліятэк міжнароднага ўзроўню – «Cycling for libraries»[1].

Упершыню мерапрыемства такога маштабу адбылося ўлетку 2011 г., калі 80 удзельнікаў з 15 розных краін праехалі 650 км па маршруце Капенгаген – Берлін. Галоўнымі яго арганізатарамі і ідэйнымі натхняльнікамі выступілі фінскія бібліятэкары на чале з сістэмным аналітыкам з Нацыянальнай бібліятэкі Фінляндыі Юкам Пенаненам і асістэнтам бібліятэкара з Хельсінскай гарадской бібліятэкі Масе Оялам пры падтрымцы Міністэрства культуры і адукацыі Фінляндыі. Цесна супрацоўнічалі яны з мясцовымі бібліятэчнымі суполкамі, а таксама з такімі арганізацыямі, як IFLA і EBLIDA. Велападарожжа пад дэвізам «Shifting traditions» («Змяняючы традыцыі») атрымалася надзіва ўдалым, спалучыўшы цікавы маршрут з актыўным і эфектыўным культурна-прафесійным абменам.

У канцы ліпеня 2012 г. велаканферэнцыя «Cycling for libraries» стартавала зноў, гэтым разам пад дэвізам «Re-positioning libraries» («Змяняючы пазіцыю бібліятэк»).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[1] Афіцыйны сайт бібліятэчнай велаканферэнцыі http://www.cyclingforlibraries.org/.

Маршрут яе пралягаў праз краіны Прыбалтыкі. Сярод сотні бібліятэкараў-раварыстаў з 20 краін свету, што ўдзельнічалі ў тым велапрабегу, пашчасціла апынуцца і прадстаўнікам з Беларусі: Н. В. Жарскай, супрацоўніцы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, і М. Важнік з Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі імя І. С. Лупіновіча.

Мэтай абедзвюх «неканферэнцый» з'яўлялася стварэнне нефармальнага асяродка для прафесійнай камунікацыі. Галоўнай ідэяй пры гэтым было ўзаемадзеянне бібліятэкараў розных культур, узростаў, спецыялізацый, якія прадстаўлялі навуковыя, публічныя, універсітэцкія і іншыя бібліятэкі.

Важнай задачай было і прыцягненне ўвагі грамадскасці да бібліятэчных праблем. Гэта атрымалася. Бібліятэкары нечакана зрабіліся гучнымі і бачнымі, праязджаючы ў яркіх камізэльках па цэнтральных вуліцах гарадоў, ды яшчэ з паліцэйскім эскортам. Мы ўвесь час адчувалі значнасць мерапрыемства. У гарадах і мястэчках Літвы, Латвіі і Эстоніі нас віталі мэры і віцэ-мэры, прадстаўнікі бібліятэчных супольнасцей і вядомыя дзеячы культуры. А міністр культуры Латвіі Ж. Яўнзэмэ-Грэндэ падтрымала нас, далучыўшыся на сваім ровары да нашага велашпацыру па Рызе. Паўсюдна з намі сустракаліся журналісты буйнейшых мясцовых газет і тэлеканалаў.

Што ж яднае такія розныя з'явы, як ровары і бібліятэкі? Абедзве, на думку арганізатараў і ўдзельнікаў «Cycling for Libraries», уяўляюць аднолькавыя каштоўнасці: дэмакратычнасць, гуманізм, даступнасць, эфектыўнасць, устойлівае развіццё і рух наперад.



Маршрут 11-дзённага велападарожжа 2012 г. правёў нас з Вільні ў Талін праз гарады і вёскі, замкі і сядзібы, лясы і палі, нацыянальныя паркі і, вядома ж, праз бібліятэкі. Падчас гэтага «самага працяглага прафесійнага бібліятэчнага мерапрыемства ў свеце» мы праехалі звыш 600 км, наведалі каля 20 самых розных бібліятэк (навуковых, універсітэцкіх, публічных) і агледзелі шэраг культурна-гістарычных і прыродных помнікаў, а таксама паўдзельнічалі ў разнастайных семінарах, культурных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мерапрыемствах, нефармальных сустрэчах і дыскусіях, што прайшлі пад знакам бібліятэчнай справы і інфармацыйных тэхналогій.

Пытанняў для абмеркавання хапала. Кожны ўдзельнік у якасці хатняга задання павінен быў акрэсліць нейкую праблему, якую ён хацеў бы вырашыць для сябе падчас падарожжа. Пералічыць усе немагчыма, але вось некаторыя з іх: будучая роля «фізічнай бібліятэкі», падтрымка адкрытага доступу да навуковай інфармацыі, электроннае кнігавыданне і аўтарскія правы, захаванне нацыянальнай дакументальнай спадчыны праз алічбоўку, кар’ерны рост і матывацыя бібліятэкараў, задачы бібліятэчнага маркетынгу, прыцягненне карыстальнікаў у бібліятэкі, праграмы па заахвочванні дзіцячага чытання і інш.

Падрабязней аб наведаных бібліятэках, а таксама пра ўдзел у дыскусіях ды іншых мерапрыемствах велаканферэнцыі можна даведацца ў блогавых запісах[2]. Акрамя таго, групу велабібліятэкараў суправаджала каманда фінскага бібліятэчнага анлайн-канала. Дзякуючы прафесійнай аператарскай працы штодня з’яўляліся новыя пяціхвілінныя ролікі пра наша падарожжа.

Чарговая велаканферэнцыя «Cycling for Libraries» адбудзецца ў 2013 г. Бібліятэкары з розных краін свету зноў збяруцца разам, каб праехаць па маршруце Амстэрдам – Брусель, цяпер ужо пад дэвізам «Libraries make a difference» («Бібліятэкі маюць значэнне»). Прывітанні ўдзельнікам даслалі Прэзідэнт Еўрапейскага Савета Герман ван Ромпуй, Прэзідэнт IFLA Сініка Сіпіла, дырэктар сакратарыята EBLIDA Вінсэнт Банэ, а таксама прадстаўнікі бібліятэчных асацыяцый і бібліятэчнай супольнасці Нідэрландаў і Бельгіі. Галоўнымі тэмамі абраны публічная бібліятэка, разнастайныя аспекты яе дзейнасці і ўвогуле перспектывы развіцця.

Трэба адзначыць, што актыўнымі ўдзельнікамі папярэдніх прафесійных велападарожжаў сёлета арганізаваны і некалькі лакальных бібліятэчных велатураў пад дэвізам «Cycling for libraries». Так, калегі са Стакгольмскай гарадской бібліятэкі ініцыявалі прабег па маршруце Стакгольм –

[2] Блог аўтара http://bibliograf.livejournal.com/81005.html.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Эрэбру (12–14 мая, Швецыя), а 25 мая бібліятэкары Калінінградскай ЦБС ладзілі мінівелатур у сваім горадзе.

Відавочна, «Cycling for libraries» – значна больш за проста канферэнцыю альбо забаўляльныя прыгоды! Пераадольваючы сотні кіламетраў на роварах, велападарожнікі знаёмяцца з бібліятэчнай справай і культурным жыццём розных краін. А на высокім міжнародным узроўні мерапрыемства сапраўды ўспрымаецца як найбольш эфектыўнае для наладжвання міжбібліятэчных сувязей і карысных кантактаў з калегамі з усяго свету.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ